ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 3 (677) | Аўторак, 19 студзеня 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

Дзённік сесіі

КАНТРАСТЫ

...У аўдыторыі — напружаная цішыня. Твары студэнтаў, якія рыхтуюцца да адказу на пытанні выцягнутага білета — сканцэнтраваныя і засяроджаныя. Мінуты, адведзеныя на абдумванне пытанняў, рашэнне задач, бягуць хутка і няўмольна. Як паспець за гэтыя мінуты сістэматызаваць у галаве ўсё тое, што вывучыў напярэдадні, не ўпусціўшы самага галоўнага? Калі паступова студэнт усё ж спраўляецца са сваім хваляваннем (а менавіта яно спачатку перашкаджае сканцэнтравацца), думкі набываюць акрэсленасць. Тады можна падыходзіць да стала экзаменатара, каб паказаць сваё веданне прадмета.

Такіх аўдыторый і кабінетаў, у якіх назіраецца аналагічная карціна студэнцкай сесіі, цяпер ва універсітэце шмат. Сесія ж прыйшла ўжо на кожны факультэт.

Экзаменацыйныя ведамасці, якіх усё больш і больш паступае ў дэканаты, нібы люстэрка паказваюць, як студэнты падрыхтаваліся да выпрабаванняў на веды. Адзнакі, выстаўленыя выкладчыкамі, зразумела, цікавяць перш за ўсё дэканаў факультэтаў. Таму яны ўважліва знаёмяцца з імі, аналізуюць.

Калі тэлефонны званок з рэдакцыі шматтыражнай газеты раздаўся ў кабінеце дэкана біялагічнага факультэта С. Ф. Алешкі, той якраз дэталёва знаёміўся з ведамасцямі. На зададзенае яму пытанне, як будучыя біёлагі трымаюць выпрабаванні на трываласць ведаў, Сцяпан Фёдаравіч адказаў:

— Пакуль што дрэнна. На сённяшні дзень (а гэта была серада, 13 студзеня) з 262 студэнтаў, якія вучацца на факультэце, 24 маюць па выніках экзаменаў нездавальняючыя адзнакі. Некаторыя нават па дзве двойкі паспелі атрымаць. Вельмі трывожыць становішча спраў у першакурснікаў. Тут 16 двоечнікаў, асабліва слабы — педагагічны паток. Многія не змаглі здаць батаніку. Экзамен па гэтаму прадмету прымаў дацэнт В. Я. Верамейчык. Аказалася «непрыступнай крэпасцю» для сямі чацвёртакурснікаў біяфізіка. Дацэнт В. С. Аруцюнава паставіла ім двойкі.

У бягучай сесіі мы ўстанавілі на факультэце цвёрдае правіла: ніякіх пераздач у час сесіі! Не здаў гэты экзамен — рыхтуйся да наступнага. У другі раз будзеш яго пераздаваць пасля ўсіх экзаменаў у строга ўстаноўленыя тэрміны. Ну, а калі і тады не зможаш паказаць сваё веданне прадмета, будзеш выключаны з універсітэта. Сур'ёзна задумацца над гэтым трэба тым, хто спадзяецца, што ўсё застанецца па-ранейшаму: неліквідаваныя «хвасты» можна цягнуць з першага да апошняга курса.

Свой першы экзамен у студэнцкім жыцці па асновах археалогіі студэнтка гр. Г-12 гісторыка-філалагічнага факультэта» Алена Гушэль здала на «выдатна».

Напярэдадні ў студэнтаў факультэта яшчэ нямала выпрабаванняў. Будзем спадзявацца, што першыя горкія ўрокі пойдуць на карысць лянівым студэнтам.

Пазней за астатнія, пачалася сесія на факультэце фізвыхавання — з 11-га студзеня, і праз два дні рэдакцыі маглі паведаміць толькі вынікі экзаменаў па спартыўных гульнях і палітэканоміі. Іх здавалі адпаведна чацвёрты і трэці курсы. Што датычыць першага з названых экзаменаў, які прымаў ст. выкладчык Б. А. Царыкаў, то вынікі яго добрыя: дзевяць выдатных адзнак, чатырнаццаць — добрых, дзве — здавальняючыя. Горш абстаялі справы ў студэнтаў трэцякурснікаў пасля экзамена па палітэканоміі. Экзаменатар дацэнт У. І. Бобрык паставіў 15 студэнтам «здавальняюча», 2 — «нездавальняюча». Толькі чатыры чалавекі здалі экзамен на «добра» і тры — на «выдатна».

Кантрасты... Гэтым словам можна ахарактарызаваць становішча спраў сёння па выніках экзаменаў на факультэтах універсітэта.

Усебаковы і грунтоўны аналіз зімовай сесіі будзе зроблены пасля студэнцкіх канікулаў.

Т. ДУБЯК.

Добрую адзнаку паставіў прафесар У. М. Калмыкоў на экзамене па філасофіі трэцякурсніцы беларускага аддзялення гістфіла Галіне Дзенісюк. Фота А. Ульянкінай.

У камітэце ЛКСМБ

Разгледжана арганізацыйнае пытанне

Днямі адбылося пасяджэнне камітэта камсамола ГДУ. Разгледжана арганізацыйнае пытанне. Сакратаром камітэта ЛКСМБ універсітэта выбраны **Міхаіл Жукевіч**, намеснікам сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце — студэнт гр. Г-31 гісторыка-філалагічнага факультэта **Міхаіл Мацвееў.**

На пасяджэнні камітэта ЛКСМБ абмеркавана работа камсамольскага бюро фізічнага факультэта за перыяд, які прайшоў пасля мінулагодніх справаздач і выбараў. У дзейнасці камсамольскага бюро ўскрыты сур'ёзныя недахопы. З мэтай іх неадкладнага ўхілення, актывізацыі ўсёй работы камсамольскай арганізацыі вырашана за яе правядзеннем узмацніць кантроль з боку камітэта ЛКСМБ універсітэта.

Коратка пра важнае

ПЕРАБУДОВЕ — АКТЫЎНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

Нядаўна аблвыканком зацвердзіў мерапрыемствы па выкананню Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне і пастаноў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР па канкрэтных пытаннях іх рэалізацыі.

Гэтыя мерапрыемствы прадугледжваюць вырашэнне шырокага кола пытанняў, у тым ліку і такіх, як стварэнне ўмоў для творчай працы выкладчыкаў і вучобы студэнтаў і навучэнцаў, шырокай магчымасці для вывучэння пытанняў тэорыі і гісторыі айчыннай і сусветнай культуры з улікам прадстаячай прафесіянальнай дзейнасці, комплекснае будаўніцтва інтэрнатаў, забеспячэнне студэнтаў і навучэнцаў гарачым харчаваннем у адпаведнасці з медыцынскімі нормамі і многае іншае.

Адным з пунктаў запісана: «Катэгарычна забараніць у вучэбны час правядзенне грамадскіх мерапрыемстваў, адцягненне студэнтаў і навучэнцаў на работы, не звязаныя з вучэбным працэсам». Вельмі важнае рашэнне, бо паводле самых сціплых падлікаў студэнт за гады вучобы семестр не займаецца ўвогуле, што, вядома, не на карысць якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

Ёсць пытанні перабудовы, вырашэнне якіх залежыць ад рэктаратаў і дырэкцый сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Але ёсць мноства такіх, што без шырокага ўдзелу выкладчыкаў, студэнтаў і навучэнцаў проста неажыццявімыя. Адным словам, неабходна далейшая дэмакратызацыя кіравання і вучэбным, і выхаваўчым працэсамі.

Нядаўна ў Беларускім інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту было праведзена анкетаванне сярод усіх катэгорый працуючых. І трэць апытаных катэгарычна заявілі, што рэальна да перабудовы тут яшчэ не прыступалі. А самыя нізкія ацэнкі — 2 балы — былі выстаўлены парткому і рэктарату за ўзровень дэмакратызацыі кіравання...

Вынікі сумныя, але яны адлюстроўваюць рэальнае становішча спраў не толькі ў гэтай ВНУ.

Вядома, перабудаваць усю работу за кароткі тэрмін немагчыма. Але калі вельмі значная частка выкладчыкаў лічыць, што іх магчымасці выкарыстоўваюцца не ў поўную меру, а ўдзел студэнтаў у перабудове абмяжоўваецца ўводам іх прадстаўнікоў у вучоныя саветы, усур'ёз гаварыць аб дэмакратызацыі не даводзіцца.

Кялейнасць прымаемых рашэнняў прыводзіць да таго, што часам скажаецца сама сутнасць патрабаванняў перабудовы вучэбнага працэсу. Напрыклад, змяншэнне колькасці аўдыторных заняткаў, каб даць студэнтам магчымасць мець больш часу для самастойнай вучобы. Думаецца, што пры творчым падыходзе, шырокім абмеркаванні гэтага пытання не з'явілася б у вышэйшай навучальнай установе нешта накшталт школьнай «прадлёнкі», калі самастойная вучоба ператвараецца ў прымусовую пад пільным наглядам выкладчыкаў.

Неўзабаве ВНУ пачнуць рыхтаваць спецыялістаў толькі па канкрэтных заяўках прадпрыемстваў і арганізацый, якія будуць часткова кампенсаваць затраты на іх навучанне. А хто цяпер стане плаціць за брак? Ёсць над чым задумацца...

Нельга маўчаць

«ПАДСТРАХОЎКА» ПАДВЯЛА

У сучасных умовах, калі ідзе перабудова вышэйшай адукацыі ў краіне і рэзка павышаюцца патрабаванні да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, зусім нецярпімыя несумленнасць, «шпаргальства» асобных студэнтаў на экзаменах і заліках. Цяпер асабліва патрэбна аб'ектыўная ацэнка ведаў будучых спецыялістаў. «Шпаргальшчыкі» перашкаджаюць гэтаму, парушаюць прынцып сацыяльнай справядлівасці, імкнуцца атрымаць незаслужаную адзнаку. Шпаргалкі так увайшлі ў прывычку, што імі карыстаюцца нават добра падрыхтаваныя студэнты, якія актыўна займаліся на працягу навучальнага года. Аднак такая «падстрахоўка» да дабра на прыводзіць. Так, на экзамене па палітэканоміі праявілі несумленнасць студэнткі эканамічнага факультэта Г. Сярэдзіна (гр. ЭТ-31) і Т. Савасценка (гр. ЭТ-32), якія карысталіся шпаргалкамі. За гэта яны і паплаціліся. Асабліва «вызначылася» на экзамене па палітэканоміі група Г-42 гістфіла. За нахабнае карыстанне шпаргалкамі атрымалі нездавальняючыя адзнакі студэнты названай групы І. Аляксеенка, В. Сечка, В. Цярэшчанка.

Цярпець далей такую ганьбу як «шпаргальства», немагчыма. Усім выкладчыкам трэба ўзмацніць барацьбу з гэтай непрыемнай з'явай. Кожны студэнт абавязаны выключыць «шпаргальства» са свайго жыцця і перасцерагчы ад яго сваіх таварышаў.

У. БОНДАРАЎ,
загадчык кафедры палітэканоміі, дацэнт.

У ПАРТКОМЕ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта, якое адбылося ў мінулую сераду, разгледжана пытанне аб ходзе выканання пастановы парткома «Аб рабоце партгруп эканамічнага факультэта па павышэнню авангардной ролі камуністаў». З інфармацыяй выступіла сакратар партбюро эканомфака Т. В. Карпей. Ад камісіі, якая рыхтавала данае пытанне для разгляду, паведамленне зрабіў намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце Я. А. Семянчук.

На эканамічным факультэце функцыяніруе пяць партгруп. Партбюро за апошні час правяло значную работу па актывізацыі іх дзейнасці. Партыйныя групы рэгулярна падключаюцца да падрыхтоўкі партыйных сходаў па найбольш актуальных праблемах, што стаяць перад факультэтам. Асаблівае значэнне надаецца перабудове вышэйшай школы, заключэнню дагавораў па мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў. Для павышэння авангардной ролі камуністаў на пасяджэннях партбюро і сходах партарганізацыі перыядычна заслухоўваюцца іх справаздачы па выкананню Праграмы і Статута КПСС. У выніку члены партыі пачалі больш адказна адносіцца да выканання сваіх даручэнняў.

На факультэце—адна з найбольш шматлікіх у ГДУ студэнцкіх партгруп. Пераважная большасць яе членаў паказваюць прыклад у вучобе і грамадскім жыцці. Сярод іх М. Васюк, Г. Маторанка, Н. Герасімовіч, П. Пятроўскі, Т. Грузд, М. Шараеў, М. Русы, В. Ігнатаў і інш.

Разам са станоўчым у рабоце партгруп адзначаліся і асобныя іх упушчэнні. У прыватнасці, указвалася на тое, што яны амаль не клапоцяцца аб стварэнні рэзерву кадраў для вылучэння іх на кіруючыя пасады.

На пасяджэнні парткома зазначана, што большасць пунктаў яго пастановы аб рабоце партгруп па павышэнню авангардной ролі камуністаў на эканамічным факультэце выконваецца. Запатрабавана неадкладна ўхіліць недахопы, якія яшчэ маюць месца ў гэтай справе.

Партыйны камітэт заслухаў справаздачу рэдактара шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» У. П. Балогі аб рэгаванні на крытыку і прапановы, якія ўтрымліваюцца ў матэрыялах шматтыражкі. Пры абмеркаванні данага пытання ўказвалася на тое, што рэагаванне на выступленні універсітэцкага друку з боку рэктарата, парткома, дэканатаў, партбюро, кіраўнікоў іншых структурных падраздзяленняў — вельмі рэдкая з'ява. На старонках газеты амаль не з'яўляюцца публікацыі пад рубрыкамі «Па слядах нашых выступленняў», «Выступіла газета. Што зроблена?» і інш.

Партком указаў на недастатковую патрабавальнасць рэдакцыі газеты ў адносінах своечасовага і аб'ектыўнага рэагавання на кожнае крытычнае выступленне і рэалізацыю выказваемых прапаноў у публікуемых матэрыялах. Прадугледжаны меры па павышэнню дзейснасці універсітэцкага друку.

ДА 70-ГОДДЗЯ ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ СССР

НА ЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

На гэтым тыдні ў нашым універсітэце заканчваецца зімовая сесія. З наступнага панядзелка ў студэнтаў пачнуцца канікулы. Пасля працяглай напружанай працы, асабліва ў перыяд здачы залікаў і экзаменаў, будучыя спецыялісты змогуць адпачыць, набрацца сіл.

Істотнай адметнасцю студэнцкіх канікулаў з'яўляецца тое, што яны пройдуць у перыяд традыцыйнага месячніка, прысвечанага чарговай гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Сёлета для Узброеных Сіл СССР ён — асаблівы. Будзе адзначацца 70-годдзе з дня гістарычнага іх утварэння. Чырвоная рабоча-сялянская Армія зарадзілася па ўказаннях стваральніка Камуністычнай партыі і першай у свеце Краіны Саветаў Уладзіміра Ільіча Леніна для абароны заваёў Вялікага Кастрычніка, нашай сацыялістычнай Айчыны. Падрыхтоўка да знамянальнага юбілею, яго святкавання носяць усенародны характар, маюць інтэрнацыянальнае значэнне.

Асаблівасць прадстаячага месячніка заключаецца яшчэ і ў тым, што ён супадае з актыўнай падрыхтоўкай і правядзеннем X Усесаюзнага з'езда ДТСААФ. Цяпер вядуцца шырокія дыскусіі аб шляхах перабудовы дзейнасці абароннага таварыства. Канчаткова гэтыя шляхі будуць вызначаны на з'ездзе.

У ходзе месячніка патрэбна даць новы імпульс рабоце па выхаванню маладога пакалення ў духу савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, высокай рэвалюцыйнай пільнасці і пастаяннай гатоўнасці да абароны Радзімы. Гэты перыяд неабходна выкарыстаць з максімальнай карысцю ў справе ўсебаковай падрыхтоўкі юнакоў да будучай службы ў радах Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Пастаўленая задача — шматгранная, і для яе вырашэння трэба выкарыстаць усе магчымасці.

Пярвічная арганізацыя ДТСААФ сумесна з камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі універсітэта плануе правесці ў дні месячніка шэраг важных мерапрыемстваў. Як заўсёды, адбудзецца Зорны агітацыйны паход па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Гомельшчыны. Студэнты наведаюць населеныя пункты Гомельскага, Петрыкаўскага, Жыткавіцкага раёнаў. Лектары раскажуць пра слаўны гераічны шлях Савецкай Арміі, высокія маральныя якасці нашых воінаў, добрасумленнае выкананне імі інтэрнацыянальнага абавязку. Пры сустрэчах з сельскімі працаўнікамі і моладдзю размова пойдзе таксама аб сучасным міжнародным становішчы, міралюбівай знешняй палітыцы Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, важных кроках, зробленых на шляху да міжнародной разрадкі і знішчэння ядзернай зброі. Як і ў папярэднія гады, самадзейныя артысты ГДУ парадуюць многіх гледачоў сваімі канцэртамі.

У гонар 70-годдзя Узброеных Сіл СССР ва універсітэце адбудзецца тыдзень стральбы, пройдуць урачыстыя сходы і мітынгі, прызыўнікі будуць здаваць нарматывы комплексу ГПА.

На кожным факультэце ГДУ вучацца былыя воіны, у тым ліку і воіны-інтэрнацыяналісты. Іх пачэсны абавязак — сустрэцца з тымі юнакамі, якім яшчэ прадстаіць служба ў радах Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Трэба расказаць аб тым нялёгкім і ганаровым абавязку, які ім давядзецца выконваць. Таму да службы ў радах Савецкай Арміі трэба рыхтавацца ўжо загадзя сур'ёзна і ўсебакова, асабліва загартоўваць сябе фізічна.

Як заўсёды, жаданымі гасцямі студэнцкай моладзі стануць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Яны падзеляцца сваімі ўспамінамі аб былых баях і паходах, раскажуць аб мужнасці і бясстрашшы таварышаў па зброі, дадуць свой наказ тым, хто з гонарам павінен працягваць эстафету баявой славы сваіх дзядоў і бацькоў.

Усесаюзны месячнік абаронна-масавай работы павінен садзейнічаць таксама далейшаму развіццю тэхнічных і ваенна-прыкладных відаў спорту, мабілізацыі членаў ДТСААФ на дастойную сустрэчу не толькі 70-годдзя Узброеных Сіл СССР, але і прадстаячай XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

У. СМІРНОЎ,
старшыня камітэта ДТСААФ ГДУ.

ЯКІ ЁН, НАШ СУЧАСНІК?

ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

Калі вакол цябе амаль штодзённа сотні студэнтаў, неяк перастаеш прыглядацца да кожнага з іх паасобку. Здаецца, усе яны, на ўлічваючы абрыс твару і адметнасцей постаці, аднолькавыя ў многім. Непаседлівасць, неўтаймаванасць душы, нярэдкая гарэзлівасць у звычайныя будні, поўная сканцэнтраванасць, відавочная сур'ёзнасць і сталасць пры іншых акалічнасцях. Скажам, у час экзаменацыйных сесій, пры выкананні пэўных адказных даручэнняў.

Усё гэта, як кажуць, агульнае, ляжыць на паверхні. Разам з тым у асобе кожнага студэнта ёсць штосьці такое, што адразу не разгледзіш, не ахарактарызуеш, не ацэніш. Часцей за ўсё яно праяўляецца ў экстрэмальных сітуацыях, калі няма часу для роздуму, а ёсць толькі лічаныя секунды для дзеяння. І ты не разважаеш, якім ажаецца канец, што можа стацца з табой...

Іменна да такіх людзей, камсамольцаў 80-ых, адносіцца і Вячаслаў Пернікаў, студэнт чацвёртага курса эканамічнага факультэта ГДУ. Ладнага спартыўнага складу, сімпатычны юнак. Пры размове не надта гаваркі, нават адчувальна сціплы. А вартасцей у гэтага юнака нямала. У яго выхаванасці, імкненні да лепшых вынікаў у вучобе і спорце, нарэшце, у жаданні быць чалавекам у самым поўным сэнсе слова. А калі так, дык ніколі не зможаш змірыцца са злом, якое яшчэ нярэдка праяўляецца ў нашым жыцці. Будзеш сапраўдным барацьбітом супраць усяго заганнага, не чакаючы ў якасці кампенсацыі падзяк ці нейкіх узнагарод. Ужо само ўсведамленне свайго высакароднага ўчынку як бы з'яўляецца маральным заахвочваннем і стымулам.

Вячаславу асабліва запамяталася яго першае выпрабаванне, пра якое адназначна не скажаш. Рашучасць і смеласць, спартыўная загартоўка юнага кандыдата ў майстры спорту па вольнай барацьбе і рызыка ўласным жыццём — на карту было пастаўлена ўсё. А здарылася гэта восенню 1983 года, перад самым адыходам на службу ў рады Савецкай Арміі. Тады Вячаслаў заступіўся за жанчыну, якую хацелі абрабаваць. Яе абаранёў, хоць і быў паранены ў няроўнай сутычцы. Давялося пэўны час праляжаць на бальнічным ложку, каб залячыць раны. Яшчэ і сёння юнаку нагадваюцца тыя мінуты, калі ў бальніцу прыходзіла жанчына, якую хацелі абрабаваць, яе муж, словы іх вялікай удзячнасці.

Нярэдка можна пачуць: хто хоць раз быў біты, той больш бяздумна абы-куды сваю галаву не падставіць. Для абываделя, баязліўца яно, магчыма, і так. Толькі не для Вячаслава Пернікава. Ён па-ранейшаму застаецца пільным байцом правапарадку, не прапусціць мімо ўвагі любое злачыннае дзеянне. Хоць афіцыйна і не з'яўляецца народным дружыннікам, не надзелены пэўнымі паўнамоцтвамі. Іх дае яму асабістае сумленне.

...У той дзень Вячаслаў вяртаўся дамоў з універсітэта. Здаваў адзін з залікаў. Увесь быў у думках аб прадстаячых экзаменах. Стан студэнта зразумець няцяжка. Тым больш, калі табе вядома, што ён па прычыне хірургічнай аперацыі прапусціў намала лекцый і практычных заняткаў. Некалькі адстаў у вучобе ад аднакурснікаў адной з лепшых на экзамэнічным факультэце груп ЭТ-42 і цяпер заклапочаны аб тым, каб навярстаць упушчанае, з поспехам завяршыць сесію.

Раптам думкі Вячаслава перарвалі словы вадзіцеля тралейбуса: «Наступны прыпынак — «плошча Леніна». У перапоўненым салоне адразу ж заварушыліся пасажыры. Каму трэба было выходзіць, пачалі працісвацца да дзвярэй. І тут Вячаслаў заўважыў, што хлопец, які стаяў побач з ім, лоўка выцягнуў з сумачкі пажылой жанчыны кашалёк і хутка падаўся наперад. Не марудзячы ні секунды, Вячаслаў моцна ўхапіў злодзея за грудзі і вывеў з тралейбуса. А жанчыне, у якой быў выцягнуты кашалёк, крыкнуў: «Праверце сваю сумачку!». Жанчына нічога не зразумела і адправілася дамоў. Толькі там яна выявіла прапажу і адразу ж здагадалася, аб чым папярэдзіў яе незнаёмы юнак. А Вячаслаў у той час з дапамогай мужчыны даставіў злодзея ў міліцыю.

Асобу злачынцы ўстанавілі хутка. Ім аказаўся нехта Аляб'еў. Яшчэ зусім малады. Ледзь дасягнуў паўналецця. Але ўжо, па яго словах, мае не адзін крадзёж на транспарце. Увесь прапіты, выглядае значна старэй за свае гады. Напэўна, у яго ёсць сабутэльніці, якія маглі аказацца побач, запамятаць Вячаслава. Аднак апошні пра гэта не думаў, не разважаў, што можа здарыцца ў будучым. А як і ў першай сваёй сутычцы з рабаўніком дзейнічаў смела і рашуча.

І вось разам з Вячаславам Пернікавым мы сядзім у рэдакцыі шматтыражкі, размаўляем аб яго яшчэ кароткім жыцці, вучобе, занятках спортам, іншых захапленнях. У сваіх учынках Вячаслаў не бачыць нічога асаблівага. Ён лічыць, што на яго месцы так паступілі б многія. У гэта хочацца верыць, хаця ў жыцці бывае і адваротнае.

У Вячаслава засталіся добрыя ўспаміны аб службе ў радах Савецкай Арміі. Меў заахвочванні, неаднаразова абараняў гонар армейскіх каманд на розных спаборніцтвах. Не развітваецца са спортам і цяпер, толькі вось для яго застаецца вельмі мала часу. Многа адымае яго вучоба. А яшчэ Вячаслаў любіць мастацкую літаратуру — гістарычную, ваенную, прыгодніцкую.

Пры размове аб выніках сесіі студэнт сказаў:

— Стараюся не адставаць. Першыя два экзамены здаў на чацвёркі.

Гутарыць з Вячаславам было цікава. Перад намі сядзеў юнак з сімпатычным адкрытым тварам, на якім застаўся ледзь прыкметны шрам — «падарунак» хуліганскай рукі амаль пяцігадовай даўнасці. І гэты шрам з'яўляецца для Вячаслава не перасцярогай, а як бы напамінам аб тым, што з усімі, хто яшчэ перашкаджае нам нармальна жыць, трэба весці рашучую барацьбу.

Б. ВАЛОДЗІН.

НА ЗДЫМКУ: Вячаслаў ПЕРНІКАЎ.

Фота У. Ульянкінай.

ДА ЮБІЛЕЮ РЭСПУБЛІКІ

1-га студзеня 1989 года беларускі народ шырока адзначыць 70-годдзе ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Сёлетні ж год прысвечаны актыўнай падрыхтоўцы да гэтага знамянальнага юбілею. Важным перыядам ён стаў 1 для калектыву нашай кафедры. На студзеньскім яе пасяджэнні мы абмеркавалі і зацвердзілі мерапрыемствы па дастойнай сустрэчы 70-годдзя ўтварэння БССР.

Перш за ўсё вырашана істотна аднавіць тэматыку кантрольных, курсавых і дыпломных работ, адлюстраваць у іх важнейшыя падзеі гісторыі БССР савецкага перыяду. У кабінеце кафедры будзе арганізавана выстаўка літаратуры і фотаматэрыялаў, прысвечаных слаўнай даце. Выкладчыкі кафедры падрыхтуюць і апублікуюць на старонках універсітэцкай шматпаражнай газеты серыю тэматычных артыкулаў. Для студэнтаў універсітэта, працоўных горада і вобласці будзе прачытаны цыкл лекцый «БССР у сузор'і брацкіх рэспублік».

У наступным месяцы прадугледжана правесці канферэнцыю чытачоў на тэму «Гісторыя савецкага грамадства 30—40 гадоў у сучаснай мастацкай літаратуры». У другой палове бягучага года запланавана падрыхтаваць на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ не менш двух даследаванняў па юбілейнай тэматыцы. У лістападзе адбудзецца навуковая студэнцкая канферэнцыя універсітэта, прымеркаваная да юбілею рэспублікі. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры пройдуць сустрэчы студэнтаў з ветэранамі вайны і працы, дэлегатамі IX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі і дэлегатамі Усесаюзнага з'езда настаўнікаў.

Г. АЛЯКСЕЙЧАНКА,
партгрупорг кафедры гісторыі СССР і БССР.

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА



ВЫСТУПІЎ ПОЛЬСКІ ВУЧОНЫ

На чарговым пасяджэнні алгебраічнага семінара, якім кіруе член-карэспандэнт АН БССР прафесар Л. А. Шамяткоў, з навуковым паведамленнем, прысвечаным поліадычным групам, выступіў госць ГДУ — дацэнт Вроцлаўскага універсітэта Польскай Народнай Рэспублікі Казіміж Глазек.

Поліадычныя групы з'яўляюцца адным з бурна развіваючыхся раздзелаў сучаснай агульнай алгебры. Прадметам іх вывучэння служаць многаарныя алгебраічныя аперацыі. Хаця асновы тэорыі поліадычных груп былі закладзены яшчэ ў 20-х гадах нашага стагоддзя ў артыкулах Дзёрнтэ, але да іх сістэматычнага вывучэння даследчыкі прыступілі толькі ў 60-я гады, калі, дзякуючы работам выдатнага савецкага матэматыка акадэміка А. І. Мальцава, пачалося інтэнсіўнае развіццё універсальных алгебр наогул. У перыяд жа паміж 20-мі і 50-мі гадамі па гэтых групах з'явілася нязначная колькасць работ. Сярод іх была праца С. А. Чуніхіна 1945 года, якая аказала прыкметны ўплыў на развіццё тэорыі.

Буйныя дасягненні ў тэорыі поліадычных груп атрыманы гомельскімі алгебраістамі за апошнія 15 гадоў. Дзякуючы работам С. А. Русакова і іншых гомельскіх спецыялістаў, гэты раздзел алгебры атрымаў істотнае развіццё.

Даследаванні польскіх алгебраістаў цесна пераплятаюцца з навуковымі інтарэсамі матэматыкаў г. Гомеля. Пасля выступлення К. Глазека адбылося зацікаўленае абмеркаванне сучасных дасягненняў алгебраічнай навукі. Ручныя абмяняліся аўтарскімі адбіткамі сваіх публікацый. Абодва бакі выказалі пажаданне працягваць навуковае супрацоўніцтва гомельскіх і польскіх алгебраістаў.

В. МАНАХАЎ,
загадчык кафедры алгебры і геаметрыі, дацэнт.

ПАМЯЦЬ

З чаго пачынаецца Радзіма

НАПЯРЭДАДНІ 70-годдзя Вялікага Кастрычніка (што вельмі знамянальна!) з усіх куткоў Савецкага Саюза з'ехаліся ў Палтаву на Усесаюзную канферэнцыю, прысвечаную пытанням гістарычнага краязнаўства, энтузіясты мясцовай спадчыны, вучоныя, пісьменнікі, дзеячы культуры. Але тое, пра што далей пойдзе размова, мае дачыненне ўжо не столькі да канферэнцыі, колькі да нашага роднага кута — Гомельшчыны. Бо той абмен думкамі і тыя дыскусіі, якія вяліся, тыя рашэнні і прапановы, якія былі зроблены, мелі адзіны сэнс і адзіную мэту — адрадзіць і развіваць краязнаўчую работу паўсюдна.

Галоўны вывад, які зрабілі ўдзельнікі канферэнцыі, заключаецца ў тым, што краязнаўства можа і павінна стаць у кожнай мясцовасці самым масавым відам навукі. Гэта, гаворачы словамі з даклада старшыні Савецкага фонду культуры, акадэміка Д. С. Ліхачова, аснова для развіцця добраахвотных таварыстваў «сяброў» таго ці іншага помніка той ці іншай тэмы, для аб'яднання моладзі вакол вызначаных тэм і заняткаў, адраджэння саматужных вырабаў, развядзення рэдкіх раслін, гадоўлі жывёлы, стварэння запаведнікаў, увогуле — «добрасуседства» з гісторыяй, культурай ці прыродай.

Любоў да свайго краю павінна быць не сузіральнай, а дзейснай — адшукаць, адкрыць, адрэстаўраваць, абараніць. Здабытае і створанае сваімі рукамі даражэй за тое, аб чым толькі ведаеш.

На Гомельшчыне ёсць цудоўныя людзі, сапраўдныя энтузіясты краязнаўства, якія па крупінках збіраюць мясцовы гісторыка-этнаграфічны матэрыял, вядуць карпатлівую работу па вызначэнню невядомых ці забытых фактаў. Гэта стваральнікі лоеўскага музея «Бітва за Днепр», гэта дырэктар Страдубскай школы Лоеўскага раёна А. С. Долатаў, гэта старшыня савета Ленінскага народнага музея Жыткавіцкага раёна У. У. Баярын, гэта многія настаўнікі — гісторыкі, географы, філолагі, імён якіх мы не ведаем. Не ведаем перш за ўсё таму, што краязнаўцы Гомельшчыны арганізацыйна раздробнены.

Пры Савецкім фондзе культуры цяпер ствараецца савет па краязнаўству. Такія саветы неўзабаве будуць створаны пры кожным з абласных аддзелаў фонду культуры. У наступным годзе пачне выходзіць усесаюзны папулярны гісторыка-краязнаўчы часопіс «Наше наследие». На канферэнцыі была прынята прапанова аб стварэнні Усесаюзнага гісторыка-краязнаўчага таварыства. Але зразумела: каб работа была дзейснай і эфектыўнай неабходна каардынацыя краязнаўчых намаганняў на месцах.

У нашым абласным цэнтры ўжо сёння ёсць умовы для гэтага. Савет ці секцыю па краязнаўству па сілах стаць выкладчыкам гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ і навуковым супрацоўнікам абласнога краязнаўчага музея. Секцыя (ці савет) аб'ядноўвалі б усіх краязнаўцаў, спецыялістаў, аматараў і аказвалі б дапамогу, напрыклад, школьным краязнаўчым гурткам, якія (так цяпер ставіцца пытанне), павінны ствараца, па магчымасці, у кожнай школе, у кожным тэхнікуме, у вышэйшых навучальных установах. Шукаць і вывучаць ёсць што. Напрыклад, гісторыю сваёй установы. Для ўсіх працы хопіць! Патрэбна толькі жаданне.

У Палтаўскім педагагічным інстытуце, напрыклад, дзе вучыліся А. С. Макаранка і В. А. Сухамлінскі, гэта зразумелі даўно. Тут створаны пакоі-музеі гэтых вялікіх педагогаў, а таксама спецыяльны гістарычны кабінет, прысвечаны навуковай дзейнасці Б. Д. Грэкава, буйнейшага савецкага гісторыка, ураджэнца Палтаўшчыны.

Добрае пачынанне ёсць і ў Гомельскім універсітэце, дзе студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыка-гісторыка У. У. Багамольнікава ствараюць археалагічны музей.

Па словах Н. К. Крупскай, краязнаўства — гэта прынцып выкладання. Кожны школьны прадмет мае значны краязнаўчы патэнцыял і што б ні вывучалася — гісторыя, літаратура, геаграфія, хімія, біялогія, мова, —краязнаўчы прынцып павінен мець месца. Бо ёсць не толькі гістарычнае краязнаўства, ёсць, напрыклад, краязнаўства лінгвістычнае, археалагічнае, эканамічнае і г. д. Ужо некалькі гадоў студэнты-філолагі, якія спецыялізуюцца па кафедры беларускай мовы Гомельскага дзяржуніверсітэта, у час летняй дыялекталагічнай практыкі збіраюць паўзабытыя, якія захаваліся толькі ў мове старога пакалення, назвы невялікіх ручаёў, рачулак, старыц і балот. Гэты збор «мовы зямлі» вядзецца планамерна ва ўсіх раёнах вобласці, а сабраныя матэрыялы друкуюцца. А які заключаны патэнцыял для краязнаўчай работы ў піянерскіх лагерах! Але ці займаюцца ёю дзеці ў час піянерскага лета?

Краязнаўству неабходны маладыя сілы. Гомельскі камсамол павінен, нарэшце, сказаць сваё слова, павінен паказаць, што і ў яго ёсць свае сапраўдныя лідэры. Добра, што невядомыя старонкі гісторыі Гомеля старажытнаруская пары ў 1986–87 гадах дапамагалі адкрываць студэнты Гомельскага універсітэта на археалагічных раскопках у гарадскім парку. Але ж студэнты таго ж універсітэта, нібы вандалы, знішчаюць помнік пачатку XIX стагоддзя — Мікалаеўскую царкву ў раёне старой Валатавы, зрабіўшы з яе «спартыўную прыладу» для ўдасканалення горнага альпінізму. Дарэчы, колькі можна гаварыць аб адным і тым жа? Можа, хто-небудзь адказны за гарадскую культуру і скажа, калі будзе выканана пастанова Міністэрства культуры БССР і пачнуцца работы па рэстаўрацыі гэтага помніка?

Гавораць, што свае праблемы лепш бачыць у параўнанні з вопытам вырашэння набалелых пытанняў у суседзяў. На канферэнцыі такая магчымасць была.

Першы прыклад — сама Палтава. Гэты горад быў выбраны месцам правядзення першай Усесаюзнай канферэнцыі па гістарычнаму краязнаўству не толькі таму, што тут у чэрвені 1709 года ў выніку Палтаўскай бітвы «слава рускай зброі ўзышла», што тут існуюць унікальныя гістарычныя помнікі. З Палтавы прагучаў голас заснавальніка новай украінскай літаратуры І. П. Катлярэўскага, тут вучыліся пісьменнік М. В. Гогаль, матэматык М. В. Астраградскі, пачыналася дзейнасць на тэатральнай сцэне М. С. Шчэпкіна. У Палтаве жылі і працавалі пісьменнікі Панас Мірны і У. Г. Караленка, тут нарадзіўся А. В. Луначарскі і буйны вучоны ў галіне касманаўтыкі Ю. В. Кандрацюк. Палтаўчане беражліва захоўваюць памяць пра вялікіх землякоў.

Акрамя ўсяго іншага, палтаўскае краязнаўства сёння — адно з самых перадавых не толькі на Украіне, але і ва ўсёй краіне. У Палтаве пачынае ўжо ствараца савет па краязнаўству, які мае вялікую падтрымку абласнога камітэта Кампартыі Украіны.

Пачуў на канферэнцыі расказ пра тое, што па ініцыятыве краязнаўцаў горада Канева Чаркаскай вобласці ў гэтым раённым цэнтры напярэдадні 70-годдзя Кастрычніка заменены 43 назвы вуліц. І парадаваўся, што такі вопыт ужо ёсць. У горадзе няма цяпер ніводнай назвы, якая б не мела адносін да яго гісторыі і сучаснага дня.

Дарэчы, на канферэнцыі гарадскім назвам была ўдзелена вялікая ўвага, бо гэтыя словы выконваюць не толькі функцыю арыентавання, але яшчэ і эстэтычную, пазнавальную і выхаваўчую. Гарадская назва павінна быць люстэркам краязнаўства — вось думка ўдзельнікаў канферэнцыі. Як бы добра было, каб ведалі гэта ў нашым Гомелі!

У Ніжнім Тагіле даўно існуе трывалы саюз краязнаўцаў і архітэктараў. Тут створаны «Архітэктурны пашпарт горада», які вызначае запаведную архітэктурную зону, а таксама зону гістарычнага ландшафту, што не падлягае забудове. Добры вопыт, дастойны пераймання!

У Данецку працуе камісія, якая займаецца пытаннямі гербабудаўніцтва. Менавіта на Украіне, як і ў Прыбалтыцы, яшчэ з 60-х гадоў пачала адраджацца гарадская геральдыка. Данецкія вучоныя прапануюць тым гарадам, якія яшчэ толькі пачынаюць задумвацца над неабходнасцю стварэння новага ўласнага герба, наступнае: трэба рашуча адмаўляцца ад дарэвалюцыйнай сімволікі, больш падкрэсліваць сувязь з гербам рэспублікі і краіны, з сімволікай дзяржаўнага флага, адлюстроўваць у гербе сучасную спецыфіку горада і яго інтэрнацыянальныя сувязі.

І яшчэ адзін аспект. На думку ўдзельнікаў канферэнцыі, для прапаганды ведаў па мясцовай гісторыі неабходна больш шырока выкарыстоўваць сродкі масавай інфармацыі, у прыватнасці, раённыя, гарадскія і абласныя газеты. Было б добра, калі б у кожнай з газет Гомельшчыны адкрылася спецыяльная старонка «Спадчына». Гэта б узняло навуковы прэстыж выданняў, прыцягнула ўвагу новых шматлікіх чытачоў.

Людзі цягнуцца да гісторыі, сапраўднай, багатай фактамі, усебаковай. Усім надакучыў той культурны і гістарычны вакуум, які, на жаль, меў месца ў апошні час, у тым ліку і ў Гомелі. Настала пара карпатліва і настойліва пачаць ствараць план нашай краязнаўчай і культурнай перабудовы.

А. РОГАЛЕЎ,
асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, сапраўдны член Геаграфічнага таварыства СССР.

З НАРОДНЫХ КРЫНІЦ

НАКУКУЙ ЗЯЗЮЛЯ...

ПА НАРОДНАМУ павер'ю, зязюля кукуе толькі да Яна, а пасля мала каму даводзілася пачуць яе, тым больш пабачыць. Але калі ў летняй цішы звініць голас гэтай птушкі, то ён прымушае кожнага з нас супыніцца, прыслухацца, ён быццам бы падказвае: «Пастой, падарожны, не спяшайся, падлічы свае гады якія адвяла табе прадвесніца лёсу». Шэрая, невялічкая, нічым, на першы погляд, не адметная птушка, яна, у вуснай народнай творчасці, ўяўляе сабою сапраўдную варажбітку, якая па-свойму размяркоўвае гады жыцця для кожнага чалавека асобна. Патрыярхальныя людзі верылі ў яе прароцтвы: як яна напрарочыць, так і збудзецца і нікуды не схаваешся ад свайго лёсу, бо зязюля (па іх наіўнаму меркаванню) знаходзілася ў цеснай сувязі з усемагутнымі сіламі, якім старажытны чалавек не мог сябе супрацьпаставіць. Нашы прашчуры баяліся, што за гэта непаслушэнства на іх зыйдзе з далёкіх нябёс злая кара. Чалавек, які асмельваўся ўзняць на птушку руку, рабіў вялікі грэх, а хто забіваў яе (няхай сабе і выпадкова), не мог замаліць такое забойства да канца свайго жыцця...

Па-рознаму ў народзе апавядаюць і пра само паходжанне зязюлі. Існуюць дзесяткі легенд і паданняў, у якіх расказваецца, што гэтая птушка ў свой час была асуджана ўсявышнім за тое, што ніколі не выседжвала сваіх птушанят, а падкідвала яйкі ў іншыя гнёзды. Ішлі гады і людзі перанеслі на акаляючы свет сацыяльную несправядлівасць, якая існавала ў грамадстве, яны надзялілі жывёл і птушак тымі ж станоўчымі і адмоўнымі рысамі, якія былі характэрны чалавеку. І ў гэтым выпадку ў незайздросным становішчы апынулася зязюля. Вось, напрыклад, як апавядаецца яе «радаслоўная» у народнай легендзе «Пра зязюлю», запісанай Л. М. Салавей:

«Быў брат бедны і сястра дужа багатая. Пайшоў брат да сястры, каб чым памагла, памілавала. А сястра скупая была, сказала, што ключы ад клеці згубіла. І стала яна нібы шукаць ключы, а брат стаяў, стаяў пад акном, чакаў, чакаў, нарэшце не вытрымаў і пайшоў. Па дарозе паваліўся, памёр ад голаду. Сястра задумалася, стала клікаць брата:

— Якуб, Якуб, вярніся, ключы знайшліся. За сваю скупасць яна стала зязюляй і цяпер увесь час кліча:

— Якуб, Якуб!

Толькі чуваць:

— Ку-ку-, ку-ку!»

А вось легенда, запісаная студэнткамі рускага аддзялення нашага універсітэта ў час леташняй фальклорнай практыкі: «Жыў-быў чалавек-вядзьмар. Ён мог ператварацца ў каго хацеў: у ваўка, птушку, рыбу, вужа. Былі ў яго вельмі прыгожыя жонка і дачка. Аднойчы яны пасварыліся. Муж-вядзьмар выйшаў з хаты, залез на гарышча і заснуў. Жонка і дачка змовіліся, падпёрлі дзверы і падпалілі будыніну. Калі загарэўся і сам вядзьмар, то быццам бы ён крыкнуў: «Табе, мая жонка, век кукаваць і сваёй пары не знаць, а табе, мая дочка, век аб зямлю біцца». Так стала жонка зязюляй, а дачка — жабай. Адтуль і паявіліся зязюля і жаба».

Даволі часта ў вуснай народнай творчасці сустракаюцца прыклады і іншага парадку, а менавіта, калі зязюля надзяляецца станоўчымі рысамі. Тады яна спачувае людзям, з'яўляецца своеасаблівым лірычна-песенным сімвалам душэўнай раўнавагі. Так, вядомы даследчык рускага фальклору С. А. Токараў сцвярджае, што: «часцей за ўсё зязюля — прадвесніца смутку. У народнай творчасці зязюля стала сімвалам сумуючай жанчыны». Колькі цудоўных песень існуе ў беларускім фальклоры, у якіх гэтая птушка ўвасабляе гора сялянкі, яе бясспраўнае становішча. Таму, мабыць, і параўноўвала яна сябе з зязюляй, яе адвечным лёсам, бо ўжо і сама не спадзявалася на лепшае будучае. І, сапраўды, слухаючы ці чытаючы тэксты песень, дзе жаночая доля параўноўваецца з зязюльчынай, абавязкова звернеш увагу на тое, што ўсе яны, без выключэння, сумныя, цягучыя. Тады адразу ж паўстае перад вачамі сацыяльнае становішча тагачаснай сялянкі-працаўніцы, якая толькі ў песнях і магла па-сапраўднаму выплакацца, выліць сваё гора.

У фальклорных творах зязюля нярэдка асацыіруецца з вобразам малодой дзяўчыны, якая павінна хутка ісці замуж ці ўжо знаходзілася ў сям'і мужа і плакалася на сваю долю, на жорсткія адносіны да яе з боку новых сваякоў:

Кукуе зязюля ў садочку,
Прыкладае галоўку к лісточку:
— Хто маё гняздзечка разаўе!
Хто маіх дзетак пабярэ!
— Разаўе гняздзечка, салавейка,
Пабяруць дзетачак, пташачкі,
Плакала дзевачка ў святліцы,
Прыклаўшы галоўку да скамніцы:
— Хто маю косачку распляце!
Хто мае лентачкі разбярэ!
— Распляце косачку, братачка,
Разбяруць лентачкі, сястрыцы.

У народзе існуе таксама павер'е, што менавіта зязюля захоўвала ключы ад вырая. Словам «вырай» у дыялектах (прыватнасці рускіх) клікалі жаваранка — першую птушку, якая прылятала 9 красавіка з выраю-раю. Геаграфічна — гэта язычніцкі рай, краіна памёршых, знаходзіўся дзесьці на ўсходзе, за сінім морам, у месцы ўзыходу сонца. І вось, калі жаваранак прылятаў, то ён атрымліваў ключык ад вясны, якую будзіў ад працяжнага зімовага сну сваім звонкім, вясёлым спевам.

Нават у наш час яшчэ месцамі можна пачуць у вёсках апавяданні пра пачуць у вёсках апавяданні пра пачуць у вёсках, якая-небудзь сівая бабтое, як, паміраючы, якая-небудзь сівая бабтое, як, паміраючы, свае родным і блізкім булька абяцала сваім родным і блізкім абавязкова вярнуцца да іх, ператварыўшыся ў шэрую зязюльку, і што зробіць яна гэта цёплай вясной ці летам. Мы ўжо адзначалі, што ў народзе дакладна ведалі пачатак зязюлі, таму тут не перыяд кукавання зязюлі, а пачынае прыходзіцца эдзіўляцца. Сяляне, асабліва ў гэта верылі дзеці, чакалі сустрэчы з ў гэта верылі дзеці, чакалі сустрэчы з бабкай. Калі яны чулі паблізу голас зязюлі, то лічылі, што душа памёршай прыляцела на спатканне з роднымі і што нябожчыца апавядае ім, як ёй жывецца на тым свеце. Мая бабка і зараз з сумнай усмешкай успамінае, як яна, тады яшчэ зусім малая дзяўчынка, таксама аднойчы пачула ў садзе кукаванне зязюлі, а потым убачыла і самую птушку. Хуценька прыбегла ў хату і сказала сваім. Члены сям'і выйшлі на падворак, дзе даслухалі звонкае «Ку-ку». Потым дарослыя, ды і дзеці таксама, разышліся хто-куды, але некаторы час працавалі моўчкі, засяроджана, нібы аддаючы пашану сваёй бабулі-нябожчыцы...

Вельмі ўдала выкарыстоўваўся традыцыйны вусна-паэтычны вобраз зязюлі ў беларускім фальклоры перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Тут яна ўвасабляла сабою маці партызана-героя, які мужна змагаецца з лютым ворагам:

У бары кукавала зязюля,
Яе песню я слухаў не раз,
Гэта ты, дарагая матуля,
Залівалася плачам па нас...

Часам зязюльчына песня параўноўвалася з песняй народных мсціўцаў, якою яны ўслаўлялі сваіх сяброў, загінуўшых за свабоду і незалежнасць роднага краю:

Не зязюлька плача і кукуе
У дрымучых віцебскіх лясах,
Гэта песню мы пяём такую,
Што люблю насвістываць ты сам.

Патрэбна адзначыць, што і ў літаратурных творах сустракаецца вобраз-сімвал зязюлі, але тут ужо ён пераасэнсаваны, напоўнены новым, індывідуальна-аўтарскім гучаннем. Так, напрыклад, у славутай паэме народнага паэта БССР Якуба Коласа «Сымон-музыка», сцэна развітання Ганны і Сымона завяршаецца кукаваннем зязюлі, якая прарочыць героям светлую будучыню, даўгалецце.

Сёння мы ведаем, што амаль усё гэта фантазія нашых далёкіх продкаў, адбітак іх сляпога пакланення перад стыхійнымі сіламі прыроды, што гэта дайшоўшыя да нас адгалоскі той старажытнай табуацыі жывёл і птушак, якой калісьці надавалася ўсемагутнае значэнне. І, тым не меней, кожны з нас, пачуўшы голас зязюлі, па-ранейшаму стрымлівае хаду і пачынае ўслухоўвацца, а, магчыма, таксама ўспамінае сваіх продкаў ці думае пра нязведанае будучае.

А. НЕНАДАВЕЦ,
асістэнт кафедры рускай літаратуры.

Цікава ведаць

МУЗЫКА І НАША ПСІХІКА

Як многа можа музыка! Спакойная і меладычная дапаможа хутчэй і лепш адпачыць, узнавіць свае сілы; бадзёрая і рытмічная падыме тонус, палепшыць настрой. Музыка здымае нярвовае напружанне, раздражняльнасць, актывізуе мысліцельныя працэсы, павышае працаздольнасць.

Аб лячэбных уласцівасцях музыкі было вядома даўно. Яшчэ 1000 гадоў назад Авіцэна рэкамендаваў у якасці лячэння дыету, працу, смех, музыку. Але яшчэ раней — у VI ст. да нашай эры вялікі старажытнагрэчаскі мыслі-цель Піфагор прымяняў музыку ў лячэбных мэтах. Ён гаварыў, што здаровая душа патрабуе здаровага цела, а тое і другое — пастаяннага музычнага ўздзеяння.

Клаўдзій Гален таксама разглядаў музыку як лякарства, а Касіадор — пісьменнік і дзеяч асцготскай дзяржавы (487 г.) — сцвярджаў, што музыка дапамагае пазбавіцца ад пачуццяў страху, злосці, нянавісці.

Мелодыі, якія прыносяць чалавеку задавальненне, ствараюць прыемны настрой, замаруджваюць пульс, павялічваюць сілу сардэчных скарачэнняў, зніжаюць артэрыяльны ціск, пашыраюць сасуды.

Музыка аказвае ўздзеянне не толькі на чалавека, але і на жывёл, і нават на расліны. Калі рыбакі ў Белым моры ўключаюць музыку, цюлені чародамі падплываюць да судна.

Такім чынам, нават тое, што ўжо вядома аб уплыве музыкі на жывы арганізм, выклікае здзіўленне і пераконвае, што ў бліжэйшыя гады мы даведаемся аб гэтым яшчэ больш, таму што працэс пазнання бясконцы.

Моладзь любіць хуткую і рытмічную музыку, якая, магчыма, кампенсуе недахоп рухальнай актыўнасці. Пажылыя людзі аддаюць перавагу плаўным, лірычным мелодыям. Пытаннямі практычнага прымянення музыкі займаюцца музыказнаўцы, псіхатэрапеўты. У Савецкім Саюзе, Польшчы, Балгарыі з кожным годам усё шырэй музыка прымяняецца ў лячэбных мэтах. На многіх прадпрыемствах у нашай краіне ўведзены спецыяльныя музычныя праграмы, якія суправаджаюць працоўны працэс, а таксама музычныя паўзы. Усё гэта павышае прадукцыйнасць працы, знікае манатоннасць некаторых відаў работ (напрыклад, на канвеерах), дапамагае хутчэй адпачыць працаздольнасць.

Вельмі важны прынцып супадзення настрою і музычнага рытму, характар музыкі павінен адпавядаць фону настрою. Так, чалавеку ў стане дэпрэсіі прапануецца праграма выхаду з такога стану: спачатку трэба слухаць мелодыі задуменныя, затым яны некалькі «святлеюць», падключаюцца творы менш сумныя, больш жыццярадасныя. Далей мелодыі мяняюцца на радасныя, вясёлыя. Для тых, у каго ўзбуджана нярвовая сістэма, магчымы зваротны парадак: спачатку трэба слухаць мелодыі хуткія, жвавыя, затым усё больш задуменныя, плаўныя.

(З кнігі «Шлях у Краіну здароўя»).

Прапануем паглядзець

НА СЦЭНЕ—МАСКВІЧЫ

Канцэртная афіша студзеня шчодрая на тэатральныя сустрэчы. На днях закончыліся гастролі Маскоўскага Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатра аперэты, а гомельскі глядач зноў сустракае масквічоў. На гэтым тыдні на сцэне Палаца культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна выступіць група артыстаў Маскоўскага тэатра «Современник».

Народная артыстка РСФСР Ніна Дарошына знаёма гледачам па фільмах «Вар'яцкі дзень», «Па сямейных абставінах», «Любоў і галубы»; заслужаны артыст РСФСР Аляксандр Вокач запамятаўся нам як выканаўца роляў у кінафільмах «Народжаная рэвалюцыяй», «Кароль Лір», «Вылет затрымліваецца»; Уладзімір Землянікін здымаўся ў фільмах «Дом, у якім я жыву», «Салдацкае сэрца», «Аповесць аб першым каханні»; у творчую біяграфію Валерыя Хлявінскага ўвайшлі ролі ў такіх кінафільмах, як «Вялікі перапынак», «Канец Любавіных», «Вечны кліч».

У г. Гомелі гэты акцёрскі ансамбль выступіць з мантажом са сцэн па п'есах В. Розава «Традыцыйны збор» і «Чатыры кроплі». Іх гастролі працягнуцца ў нашым горадзе да 21-га студзеня.

На творчую сустрэчу з гамяльчанамі прыехаў артыст, якога ведаюць і любяць усе — і дарослыя, і дзеці. Гэта — народны артыст РСФСР Зіновій Гердт. Яго першае выступленне ў Гомелі адбудзецца сёння ў 16 гадзін у актавай зале універсітэта. 23—24 студзеня ён выступіць на сцэне Палаца культуры «Гомельпрамбуд».

На канцэрт артыстаў тэатра «Современник» білеты можна набыць у касе Палаца культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна, на творчую сустрэчу з З. Гердтам—у прафкоме студэнтаў ГДУ.

Запрашаем аматараў тэатра і кіно на сустрэчы з маскоўскімі артыстамі.

Л. БАЛАЖ,
рэдактар Гомельскай абласной філармоніі.

Спорт

СТАРТАВАЛА СПАРТАКІЯДА «ЗДАРОЎЕ»

Учора спаборніцтвамі шахматыстаў і валейбалістаў у нашым універсітэце ўзяла старт XIX спартакіяда «Здароўе». У ёй удзельнічаюць выкладчыкі і супрацоўнікі. Спартакіяда праводзіцца з мэтай актыўнага ўкаранення фізічнай культуры ў жыццё выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ, прапаганды здаровага ладу жыцця, карысной арганізацыі адпачынку, масавай падрыхтоўкі і здачы нарматываў комплексу ГПА.

У праграму спартакіяды ўключана восем відаў. Акрамя названых, гэта — кулявая стральба, плаванне, лыжны спорт, міні-футбол, настольны тэніс, спартыўнае рыбалоўства. Галоўнымі суддзямі зацверджаны адпаведна Г. А. Фрыдман, Ф. М. Семяненка, Ю. В. Жураўлёў, В. М. Гіль, Л. М. Марозава, У. П. Астахаў, М. А. Кульбакоў, У. А. Баркоў.

Спаборніцтвы па міні-футболу прадугледжана правесці 2—5 лютага, плаванню — 26 студзеня, кулявой стральбе — 28 студзеня, настольнаму тэнісу — 1 лютага, лыжнаму спорту — 13 лютага, па спартыўнаму рыбалоўству з выездам — у сакавіку ў залежнасці ад умоў надвор'я.

Пераможца ў агульнакамандным заліку вызначаецца па лепшых выніках у пяці відах спорту праграмы спартакіяды. Факультэт, які зойме агульнае камандное першае месца ў спартакіядзе «Здароўе», узнагароджваецца пераходным прызам і граматай спартклуба. Пераможцы ў асабістым першынстве ўзнагароджваюцца граматамі і каштоўнымі прызамі, а заняўшыя другое і трэцяе месцы — граматамі.

Трэба спадзявацца, што ў год чарговых зімовых і летніх Алімпійскіх гульняў універсітэцкая спартакіяда «Здароўе» пройдзе на самым высокім узроўні.

Г. ВАРАТНІЦКІ,
старшыня спартклуба ГДУ.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктарата, профсаюзнага камітэтаў, камітэта ЛКСМБ Гомельскага государственного университета. Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кнігазнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ 02024
Аб'ём — 1 друк. арк.
Тыраж 2000 экз. Заказ 46.